БРЫЛЁЎСКІ летапіс

№ 20 (102)
чэрвень
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Калі заўтра вайна

с.1



КАПІЯВАННЕ ЗАБАРОНЕНА

Праблема с.2

Работа с.3

На вярце с.6

"Праблемнае" малако

Л.М.Пынцікава: "Я не разумею!.."

3 чэрвеня 2009 года старшыня выканкама Брылеўскага сельскага Савета Уладзімір Ільіч Мажораў праводзіў прыём па асабістых пытаннях. За дапамогай звярнулася Любоў Мікалаеўна Пынцікава -- малаказборшчык УКАП "Фірма "Днепр". Яна скардзілася на тое, што кіраўніцтва фірмы мала звяртае ўвагі на закуп малака ў насельніцтва ў частцы тэхнічнага забяспячэння малаказборшчыка ўсім неабходным. Маецца на ўвазе тое, што калёсы, на якіх перавозіцца малако, даводзіцца рамантаваць выключна за свой кошт; што не хапае фляг для малака; што конь, які належыць фірме, не атрымлівае адтуль ні грама сена. Гэта, па меркаванню Л.М.Пынцікавай, нешта незразумелае, і тут трэба разабрацца. У.І.Мажораў папрасіў Л.М.Пынцікаву усе свае пытанні і прапановы аформіць у пісьмовым выглядзе -- каб можна было з нейкай канкрэтыкай звяртацца да кіраўніцтва аграфірмы "Днепр". Л.М.Пынцікава згадзілася, што прапанова правільная, і тут жа ўсе свае думкі паклала на паперу. Хочацца спадзявацца, што кіраўніцтва аграфірмы зверне ўвагу на ўзнятыя праблемы, бо "прыватнае" малако -- важны момант у агульнадзяржаўнай стратэгіі харчовай бяспекі.

«Я вам пішу...»

Трэба сказаць, што праблемы з "недзяржаўным" малаком існуюць не толькі ў нашых Брылях. Вось якое пісьмо надрукавала 3 чэрвеня 2009 г. газета "Аргументы и факты":

ПОЧЕМУ ДЕРЕВЕНСКОЕ МОЛОКО ИСПАРЯЕТСЯ?

"Сдаём молоко государству с 1970 года. Всегда базисная жирность была 3,4%, в этом году её увеличили до 3,6%. Что нам – племенных голландских коров завезли? Теперь из-за повышения жирности в зачёт идёт молока меньше. С начала года по конец мая с нас сняли 130 литров. Что будет до конца года? Это несправедливо! Ведь молоко с жирностью 3,4 не испаряется, молокозаводы из него производят продукцию, получают прибыль. Во время кризиса, когда нужно помочь беднейшим слоям населения выжить, стараются отобрать последнее. Для деревенских пенсионеров сдача молока -- возможность получить прибавку к мизерной пенсии. Это большой труд: траву надо скосить, высушить, привезти, сложить... Нас, деревню, всю жизнь держат за рабов. И потом чиновники удивляются, почему молодёжь бежит из села без оглядки на построенные домики и агрогородки.

В.И.Страх, д.Крево, Сморгонский район."

Кіраўніцтва розных узроўняў вельмі добра разумее ўсю гэтую праблематыку. Агучваюцца вельмі слушныя прапановы. Вось, напрыклад, меркаванне старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра Іванавіча Панцюхова *(«Белорусская нива», 18.06.2009 г.)*:

У.І.Панцюхоў

«Есть простая истина — каждый должен заниматься своим делом. К чему я клоню? Сельсоветы занимаются сбором молока у населения. Но сегодня требования к его качеству повысились. Обнаружат в партии полезного продукта ингибирующие вещества, не получит сельчанин ни копейки. Откуда они в молоке? Вариантов множество. Начиная с того, что бидон молокосборщик плохо помыл, и заканчивая тем, что кто-то из сельчан молоко разбавил. К сожалению, и такое еще бывает. Считаю, не стоит подобным образом подходить к сбору молока. Вопрос этот продумать нужно. Закрепить специального молокосборщика или от района, или от перерабатывающего предприятия с приспособленной тарой, какими-то экспресс-тестами на определение качества молока. Тогда можно будет, не выезжая с подворья, определить, есть ли смысл добавлять это молоко в общий котел».

Як бачым, прапановы вельмі добрыя. І дай, Божа, каб яны здзейсніліся як мага хутчэй -- пакуль людзі яшчэ не паздавалі сваіх апошніх нешматлікіх кароў.

Давесці да ладу

Ураган, што адбушаваў над нашымі вёскамі 11 чэрвеня, як кажуць, нарабіў спраў. У Брылях у зоне сваёй адказнасці на вуліцы Юбілейнай за выпраўленне сітуацыі адразу ўзяліся работнікі ўчастка МУКП "Жылкамгас" на чале з Аляксандрам Мікалаевічам Сілковым. Разразаліся паваленыя дрэвы, грузавая аўтамашына адвозіла дровы на тэрыторыю ля кацельнай. І праз кароткі час наступствы стыхіі на тэрыторыі нашага гарадка былі ліквідаваны. Як сказаў А.М.Сілкоў, іх служба і існуе дзеля таго, каб даводзіць да ладу сітуацыю менавіта ў такіх форс-мажорных умовах. ***М. Я.***

Сладжана працуе брыгада ЖКГ. Справа - А.М.Сілкоў.

А.Г.Мяшкоў

А.Г.Мяшкоў, С.М.Ермалаеў, М.М.Жураўкоў, М.А.Карнееў

Тры дні спатрэбілася брыгадам раённых "Электрасетак", каб памяняць слупы і аднавіць падачу электраэнергіі спажыўцам.

ДАПАМОГА

У навакольных лясах, што пацярпелі ад урагану, пачаліся работы па ачыстцы плошчаў ад буралому. У Брылі прыбылі брыгады лесарубаў з розных ляс-

ных гаспадарак Беларусі. Яны ў асноўным размесціліся ў будынку старой Брылеўскай школы. Работа будзе весціся вахтавым метадам, і праз два тыдні прыедзе новая працоўная змена. Па меркаваннях спецыялістаў, увесь неабходны аб'ём работ будзе выкананы да снежня бягучага года.

"Хочаш міру - рыхтуйся да вайны"

12 чэрвеня 2009 г. ў Брылеўскім сельскім Савеце адбыліся планавыя мабілізацыйныя вучэнні, у ходзе якіх правяралася работа нашага пункта збору і адпраўкі ваеннаабавязаных.

Вучэннямі кіравалі прадстаўнікі Магілёўскага міжраённага ваенкамата -- галоўны спецыяліст мабілізацыйнага аддзялення Уладзімір Брунавіч Трэйель, старшы памочнік начальніка мабілізацыйнага аддзялення Сяргей Уладзіміравіч Хортаў і інспектар па ўліку і браніраванню мабілізацыйнага аддзялення Алена Станіславаўна Лібузер. Яны ўважліва сачылі за дзеяннямі адказных асоб сельвыканкама, рабілі заўвагі, знаёмілі з новымі асаблівасцямі мабілізацыйнага працэсу.

У.Б.Трэйель

С.У.Хортаў

А.С.Лібузер

Старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета Уладзімір Ільіч Мажораў і сакратар выканкама Надзея Іванаўна Рамашкевіч дакладна акрэслілі маючую схему ўзаемадзеяння паміж рознымі мабілізацыйнымі кампанентамі. Пра межы сваёй адказнасці паведамілі Марына Міхайлаўна Бірукова і Наталля Віктараўна Масіеўская. Аб значэнні хуткасці і дакладнасці пры выкананні сваіх абавязкаў распавялі Сяргей Анатольевіч Васюрэнка і Уладзімір Аляксандравіч Іваноў.

У.І.Мажораў

Н.І.Рамашкевіч

Пасля працы былі падведзены вынікі, і брылеўцы атрымалі высокую адзнаку.

М.М.Бірукова

Н.В.Масіеўская

С.А.Васюрэнка і У.А.Іваноў

Такія вучэнні ладзяцца штогод і спрыяюць лепшай практычнай ваенна - мабілізацыйнай падрыхтоўцы мясцовых спецыялістаў.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.

Заняткі з кабінета перанесліся ў "палявыя" умовы.

kamunikat.org

Імгненні паэзіі

Моему сыну Сашеньке посвящается.

Однажны сказочная ночка
Преподнесла тебе сыночка.
Родился он ну просто крошка,
И вот растёт уж понемножку.
Однажды мама захлопочет –
Уже подрос её сыночек!
Ну что за ручки, что за ножки!
Он сам шагает по дорожке!
Дорожка шире и ровнее,
Шаги уверенней, смелее,
И все преграды позади,
И нет конца его пути.
Идёт,
вершины покоряет,
Но в этом и отец помог.
И мама гордо замечает:
-- Да, люди, это наш сынок!

27.08.1999 г.

ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ШКОЛЬНІКАЎ

Працягваецца рамонт у Брылеўскай школе-садзе. Дзеля бяспекі навучэнцаў было вырашана ліквідаваць усе казыркі над уваходамі ў будынак. *(17.06.2009 г.)*

Ствараюць прыгажосць

Васіль Віктаравіч Іванціў і Таццяна Яўгенаўна Фралова шмат гадоў працуюць у Брылеўскай школе. І кожны год яны сваімі рукамі ствараюць прыгажосць -- каб у прыгожым асяродку выспявалі прыгожыя думкі і прыгожыя ўчынкі.

5 чэрвеня 2009 года
Пелагея Максімаўна
ГАРНАСТАЕВА
адзначыла 91-годдзе.

Віншуем і жадаем нашай Максімаўне добрага здароўя, узнёслага настрою, бадзёрасці і ўсяго самага найлепшага!

На варце здароўя

Антон Майбураў на прыёме у доктара.

У сувязі з выходам у дэкрэтны адпачынак загадчыцы Брылеўскага ФАПа А. У. Аляксейковай, з'явіліся пэўныя цяжкасці, але работа ФАПа не спынілася. Значную дапамогу мясцовым жыхарам аказвае медыцынскі персанал Сухарэўскай участковай бальніцы. Прыём праводзяць загадчыца Сухарэўскай бальніцы Кацярына Генадзьеўна Шумілка, участковая медсястра Галіна Іванаўна Цікавенка, акушэрка Людміла Рыгораўна Стральцова і іншыя. Пасільную дапамогу заўсёды аказвае санітарка Брылеўскага ФАПа Наталля Віктараўна Масіеўская. Ёсць інфармацыя, што ў жніўні на Брылеўскі ФАП будзе працаўладкаваны адзін з выпускнікоў медвучылішча, які атрымае накіраванне ў Магілёўскі раён.

Ала ЯЦКОВА.

Л.Р.Стральцова, Н.В.Масіеўская і Г.І.Цікавенка

22 чэрвеня 2009 г. у Брылях працаваў перасоўны кабінет камп'ютарнай рэнтгенаграфіі. Усе жадаючыя змаглі зрабіць флюараграфію з дапамогай сучаснага абсталявання.

БРЫЛЁЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ

ПОЛЫМЯ

№ 6, 2009 г.

Вядомы беларускі паэт Анатоль ЗЭКАЎ -- пра тое, што хвалюе:

* * *

Анатоль Зэкаў

На мове беларускай нашай
чытае вершы ўнучка Маша.
Чытае нараспеў, працяжна,
нібы на смак спрабуе слова,
і паміраць мне ўжо не страшна,
бо не памрэ са мною мова.

* * *

Калі хварэем мы, то лечаць
нас ад хвароб не дактары,
а родныя гаі, бары,
лугі квяцістыя і рэчкі.
І не таблеткі, не ўколы
нас не даюць сагнуць у крук,
а цеплыня любімых рук
і дабрыня вачэй вясёлых.

ЗВЯЗДА

24. 06. 2009 г.

КАЛОДЗЕЖ

● Пры будаўніцтве калодзежа неабходна было ўлічваць шэраг фактараў, і, перш за ўсё, выбраць самы "спрыяльны" час. Звычайна гэта была новая фаза Месяца, "маладзік", так званыя "шчаслівыя" дні, ранішнія гадзіны дня (да паўдня).

Затым неабходна было адшукаць "воднае" месца. Для гэтага выкарыстоўвалі такі спосаб: на месцы, дзе збіраліся капаць калодзеж, раскладвалі патэльні. Калі раніцай, пры ўзыходзе сонца, патэльня пакрывалася вадзянымі струменьчыкамі, гэта азначала, што калодзеж на гэтым месцы будзе доўга паіць вадой усю сям'ю.



● Першым капаць калодзеж павінен быў сын жывых бацькоў, фізічна здаровы чалавек. Такую справу не даручалі тым, за кім замацаваліся такія выразы: "у яго цяжкая рука" ці "у яго дурное (дрэннае) вока".

● "Першай" вадой паілі ўсіх членаў сям'і, хатнюю жывёлу і птушку. Пільна сачылі за тым, каб "першую" ваду не выпіў хто-небудзь іншы і не забраў здароўе сям'і, дабрабыт і прыбытак у гаспадарцы.

● Калі ў доме была бяздзетная жанчына, то "першую" ваду перш за ўсё давалі пакаштаваць ёй.

● З прыходам хрысціянства выкарыстоўваць ваду з новага калодзежа можна было толькі пасля яго асвячэння.

● Чысціць калодзеж таксама дазвалялася толькі ў пэўныя дні года. Самым спрыяльныя для гэтага днём быў пярэдадзень Івана Купалы: пасля гэтага вада ў калодзежы будзе асабліва карыснай і "здаровай".

● Забаранялася чысціць калодзежы пасля Уздвіжання (27 верасня). У народзе існаваў і шэраг правілаў, якія абмяжоўвалі кола тых людзей, якія могуць браць ваду з калодзежа. Перш за ўсё, асабліва ў дні вялікіх святаў, забаранялася браць ваду чужым людзям, пабочным асобам – каб не перадаць ім дабрабыт сям'і і прыбытак у гаспадарцы.

МВ Магілёўскія ведамасці

18. 06. 2009 г.

НАС СТАЛО МЕНЬШЕ

По предварительной оценке, численность населения области на 1 мая 2009 года составила 1 миллион 120, 4 тыс. человек и сократилась с начала года на 2,7 тысячи. По данным облстатуправления, за январь – апрель этого года на Могилёвщине родилось 4004 ребёнка. Умерло 5809 человек.

Народная газета

4.06.2009 г.

ЧТО ДЕЛАТЬ, ЕСЛИ ВЫ ОБНАРУЖИЛИ НА СВОЁМ ТЕЛЕ КЛЕЩА?

Как только в Беларусь приходит тепло, к врачам очень часто обращаются люди, пострадавшие от укусов клещей.

Вот что необходимо сделать сразу же:

● Удалить клеща сразу после его обнаружения, поскольку угроза возникновения болезни Лайма резко возрастает, если клещ находится на теле человека свыше 18 часов.

● При этом недопустимо использовать жирный крем и масло, надавливать на клеща пинцетом!

● Чтобы избавиться от впившегося в кожу клеща, нужно сделать скользящую петлю из прочной нити и накинуть её на клеща как можно ближе к хоботку. Затянув петлю, следует раскачивать нитку, а с ней и насекомое, пытаясь извлечь его из кожи.

● Можно использовать продезинфицированную или прокалённую и остуженную иглу, чтобы изъять клеща, как занозу.

● Место укуса обработать йодом, а сам "трофей" отнести на исследование в территориальный центр гигиены и эпидемиологии. В случае необходимости провести профилактическое лечение.

Аргументы и факты

24.06.2009 г.

КОМЕНДАНТСКИЙ ЧАС

В Беларуси рассматривается возможность введения "комендантского часа для несовершеннолетних". Разрабатывается проект закона, в соответствии с которым нахождение несовершеннолетних на улицах после 23.00 будет возможно только в сопровождении взрослых. В случае принятия этого закона родители несовершеннолетних, которые будут находиться на улице после 23.00 без сопровождения, будут привлекаться к ответственности. Разработка законопроекта вызвана тем, что большинство совершаемых несовершеннолетними преступлений приходится на ночное время.

ГАЛАШЭННІ

Адной з самых важных складовых частак пахавальнага абраду з'яўляюцца галашэнні па памерлых.

• Галашэнні былі пабудаваныя на дыялагічнай аснове. Сваякі памерлага звярталіся да яго з рытарычнымі пытаннямі-зваротамі: на каго ж ты нас пакінуў? Чаму не возьмеш нас з сабой? Як нам надалей жыць без цябе?

"А мая мамачка, а мая мілая,
А прабачай мяне, што я рэдка цябе адведвала.
Я ж далёкая, я ж адзінокая, з малымі дзеткамі.
А мая мамачка, чаму ж ты не адзываешся?"

• Унікальнасць галашэнняў была ў тым, што яны дапамагалі чалавеку хаця б на некаторы момант выплеснуць негатыўныя эмоцыі і тым самым ураўнаважвалі псіхалагічны стан і таго, хто галасіў, і тых, хто прысутнічаў побач.

• Аднак у той жа час у народнай культуры існа-валі так званыя залатыя правілы. Напрыклад, тыя, хто галасілі, добра ведалі, што рабіць гэта можна з вызначанай перыядычнасцю. Інакш гэ-та можа дрэнна ўплываць на псіхалагічны стан людзей.

• Акрамя гэтага, існавала строгая забарона га-ласіць пасля захаду сонца. У народзе існавала глыбокая перакананасць, што ўсе слёзы, якія будуць выплаканы пасля захаду сонца, памер-лы будзе насіць за плячыма ў вялікім мяху або апынецца замест нябёсаў у падзямеллі.

З Быхава прыйшла жалобная вестка: памёр Зміцер Лазараў. Бываючы ў Брылях у сваіх суродзічаў Саўчыных, заўсёды заходзіў у Дом культуры. 29 кастрычніка мінулага года хлопец нават паўдзельнічаў у мерапрыемствы, што ладзіла бібліятэка, пабываў на рэпетыцыі канцэрта. Ніхто з нас і не думаў, што ён вельмі пакутаваў ад цяжкой хваробы... У снежні яму зрабілі складаную аперацыю. 9 лютага ён сустрэў свой 18-ы дзень нараджэння. А 8 красавіка, на святое Благавешчанне, Зміцера не стала. Такі вось бязлітасны лёс...

А у памяці засталіся Зміцерава нешматслоўнасць і ясная чысціня ягоных не па гадах мудрых вачэй.

Міхаіл Іванавіч ШАМЯНКОЎ (1952-2009)

19 чэрвеня 2009 года на 58-м годзе жыцця памёр Міхаіл Іванавіч Шамянкоў.

Ён нарадзіўся ў 1952 годзе ў в. Качурына ў сям'і Івана Цімафеевіча і Надзеі Сяргееўны Шамянковых. Скончыў Брылеўскую школу. Потым атрымаў дыплом ветэрынарнага тэхнікума, але вырашыў звязаць сваё жыццё не з сельскай гаспадаркай, а з рамантыкай марскіх вандраванняў. У сталіцы Эстоніі Талліне скончыў мараходнае вучылішча, і шмат гадоў працаваў на судах гандлёвага і рыбалоўнага флоту, пабачыўшы амаль увесь свет.

У Талліне пазнаёміўся з прыгожай дзяўчынай Людмілай, з якой у хуткім часе абраў шлюб і якую прывёз у роднае Качурына.

Жыццёвыя выпрабаванні і напружаны рытм існавання паклаліся адбіткам на здароўе, і цяжкая хвароба паступова забірала сілы. Але Міхаіл Іванавіч ніколі не скардзіўся на цяжкасці і заўсёды быў прыкладам светлага аптымізму.

На вялікі жаль, кароткім атрымаўся ягоны жыццёвы шлях, але ўсе, хто ведаў Міхаіла Іванавіча, заўсёды будуць помніць ягоную шчырую дабразычлівасць, нетаропкую разважлівасць і ўзнёслае пачуццё гумару.

Бывай, Міхаіл Іванавіч!..

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

"БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС"
Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Выдаецца з мая 2006 г.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
На правах рукапісу.
Пры перадруку матэрыялаў
спасылка на "Брылёўскі летапіс" абавязковая.
© "Брылёўскі летапіс", 2009
Звярстана і надрукавана
на прыватным абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі,
вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com